# АД ХРЫСЦІЯНСКАЙ ГРАМАДЫ ДА КАМІТЭТА: БЕЛАРУСКІЯ ПРАВАСЛАЎНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

*Горны А. С.*
*(Гродна, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы)*

У сучасны час Беларуская Праваслаўная Царква надавае значную ўвагу развіццю і актывізацыі дзейнасці розных праваслаўных грамадскіх аб’яднанняў, таварыства, брацтваў. Дадзеныя ўстановы выконваюць не толькі місіянерскую функцыю, але і садзейнічаюць пашырэнню дабрачыннасці, асветніцтва, спрыяюць кансалідацыі моладзі і іншых грамадскіх груп вакол хрысціянскіх каштоўнасцей. Трэба заўважыць, што праваслаўная грамадская актыўнасць на беларускіх землях мае шматвякавую гісторыю, якую неабходна глыбока даследаваць дзеля таго, каб звязаць гістарычны вопыт і сучасныя тэндэнцыі развіцця праваслаўных арганізацый.

Мэта дадзенай публікацыі – адлюстраваць асноўныя накірункі работы беларускіх праваслаўных грамадскіх арганізацый, якія існавалі ў першай трэці XX ст., у першую чаргу ў міжваенны перыяд, і дзейнічалі ў рамках працэсу актыўнага ўзаемадзеяння беларускага нацыянальнага руху і Праваслаўнай царквы. Калі праблема дзейнасці праваслаўных арганізацый у Вялікім Княстве Літоўскім і на беларускіх землях у Расійскай імперыі ўжо дастаткова шырока раскрыта ў дарэвалюцыйнай і сучаснай беларускай гістарыяграфіі, то вышэй адзначаная тэматыка з’яўляецца маладаследаванай і толькі некаторыя з яе аспектаў былі адлюстраваны ў працах беларускіх гісторыкаў[1; 2]. Наяўнасць пэўнага інтарэсу ў часткі вернікаў і духавенства да нацыянальнага складніку ў царкве яшчэ больш актуалізуе праблему дзейнасці беларускіх праваслаўных арганізацый у гістарычнай рэтраспектыве.

Пасля 1917 г., калі Праваслаўная царква страціла падтрымку імперскіх уладаў, многія праваслаўныя грамадскія арганізацыі, якія прытрымліваліся заходнерускіх альбо манархічных поглядаў, спынілі сваё існаванне альбо былі ліквідаваны. Праваслаўнае духавенства, аказаўшыся ў новых палітычных і сацыяльных умовах (асабліва пасля далучэння Заходняй Беларусі ў склад Польшчы ў 1921 г.), пачало шукаць падтрымкі і апоры

з боку тых палітычных сіл, якія дапамаглі б яму захаваць праваслаўную ідэнтычнасць і працягнуць пастырскае служэнне. Адным з такіх актораў на тагачаснай палітычнай сцэне выступаў беларускі нацыянальны рух. Удзел праваслаўных святароў у дзейнасці беларускіх грамадскіх і палітычных арганізацый назіраецца ўжо з 1915 г. [3]. Са свайго боку, беларускія нацыянальныя сілы таксама вылучалі перад Праваслаўнай царквой шэраг сваіх патрабаванняў, галоўным з якіх было дамаганне беларусізацыі царкоўнага жыцця і падтрымкі ва ўмацаванні сярод вернікаў не толькі рэлігійнай, але і нацыянальнай ідэнтычнасці. Дарэчы дадзеную ініцыятыву падтрымала тагачаснае вышэйшае царкоўнае кіраўніцтва. Аб гэтым сведчыць ліст Патрыярха Ціхана (Бялавіна) да старшыні ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі В. Ластоўскага, у якім праваслаўны першаерарх дазволіў ужываць беларускую мову ў дадатковых набажэнствах, казаннях і катэхізацыі [4, с. 27].

Далучэнне праваслаўнага духавенства і інтэлігенцыі да беларускага руху абумовіла стварэнне праваслаўных арганізацый, якія ўжо павінны былі мець нацыянальны характар і аказваць дапамогу свецкім дзеячам у пашырэнні беларускай асветы. Адной з першых такіх арганізацый можна лічыць “Гродзенскую беларускую хрысціянскую грамаду”, створаную ў Гродна ў сакавіку 1919 г. [5, с. 241]. Яе стваральнікам і кіраўніком з’яўляўся протаіерэй Іаан Карчынскі – святар, які з 1918 г. пачаў актыўна супрацоўнічаць з мясцовым беларускім актывам і ўжываць беларускую мову ў набажэнствах [6, с. 569]. Грамада мела ў горадзе ўласнае памяшканне, дзе 4 мая 1919 г. быў адчынены беларускі кааператыў. Дзейнасць арганізацыі, аднак, не набыла значнага маштабу, бо польскія ўлады, якія занялі горад у гэты перыяд, пачалі ўжываць рэпрэсіўную палітыку ў дачыненні да беларускіх структур і грамадскіх дзеячоў [5, с. 241 – 242].

У крыніцах сустракаецца інфармацыя аб заснаванні ў 1919 г. у Мінску, у перыяд польскай акупацыі горада, Беларускага царкоўнага брацтва. Арганізатарамі брацтва выступалі беларускі царкоўны і грамадскі дзеяч Т. Вернікоўскі і епіскап Слуцкі, часовы кіраўнік Мінскай епархіі Мелхіседэк (Паеўскі). Згодна з біяграфіяй Вернікоўскага, выдадзенай ў 1936 г., гэтае брацтва цесна супрацоўнічала з духавенствам Мінскай епархіі і нават мела свае прадстаўніцтва ў Бабруйску, Ігумене і Рэчыцы [7, с. 7]. Разам з тым, іншых звестак аб дзейнасці дадзенай структуры пакуль не выяўлена.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі ў склад Польшчы ў 1921 г., адным з галоўных цэнтраў беларускага культурнага, палітычнага і рэлігійнага жыцця стаў горад Вільня. Тут яшчэ да Першай сусветнай вайны існаваў шэраг праваслаўных арганізацый філантрапійнага і місіянерскага характару, найбольш вядомай з якіх было Віленскае Свята-Духаўскае брацтва. Пасля вайны дзейнасць брацтва не была адноўлена, хаця гэтая

арганізацыя мела значныя гістарычныя традыцыі ў віленскім асяроддзі. Нягледзячы на тое, што, напрыклад, украінскі нацыянальны рух звярнуў вялікую ўвагу на адраджэнне ролі брацтваў ва ўкраінскім царкоўным жыцці, беларускія дзеячы і праваслаўнае духавенства абрала іншыя формы працы ў гэтым накірунку.

Цэнтрам віленскага беларускага жыцця былі Свята-Троіцкая царква і манастыр, у памяшканнях якога знаходзіўся цэлы шэраг розных беларускіх арганізацый і установў. У самой царкве з 1919 г. рэгулярна чыталіся беларускія казанні [8]. Таму невыпадкова, што менавіта тут у 1921 г. узнікла Беларускае Свята-Троіцкае праваслаўнае таварыства. Да нашых дзён захаваўся статут гэтай арганізацыі, паводле якога мэтамі таварыства абвяшчаліся: 1) распаўсюджванне хрысціянскай маралі і рэлігійнасці; 2) утрыманне цэркваў і іншых святыняў; 3) абарона правоў і інтарэсаў праваслаўнай царквы, беларускага праваслаўнага духавенства перад польскімі ўладамі; 4) распаўсюджванне беларускай асветы ў хрысціянскім духу [9, арк. 4].Дзейнасць таварыства павінна была ахопліваць Віленшчыну, але пры спрыяльных умовах магла пашырыцца і на ўсю Беларусь. Згодна са статутам, таварыства мела права на арганізацыю розных культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў, будаванне і адчыненне цэркваў, манастыроў, капліц, прытулкаў і школ [9, арк. 6]. Стваральнікамі арганізацыі, хутчэй за ўсё, выступалі тагачасныя беларускія праваслаўныя актывісты – М. Красінскі, протаіерэй М. Пліс і іншыя. У крыніцах пакуль не выяўлены какрэтныя прыклады практычнай дзейнасці таварыства, аднак можна дапусціць, што яно прыклала значныя намаганні для пашырэння беларускасці прынамсі ў асяроддзі віленскіх праваслаўных семінарыстаў у першай палове 1920-х гг.[10, с. 41].

У міжваенны перыяд значную дзейнасць па пашырэнню нацыянальнага кампанента ў Праваслаўнай царкве разгарнулі ўкраінскія эліты. Адной з найбольш вядомых украінскіх праваслаўных арганізацый было “Таварыства імя мітрапаліта Пятра Магілы”, заснаванае ў Луцку ў 1931 г., якое пачало шырокую працу па перакладу богаслужбовых кніг на ўкраінскую мову. Актыўныя працэсы па ўкраінізацыі царквы не маглі не адбіцца на дзейнасці беларускіх праваслаўных дзеячоў, якія былі гатовыя пераняць даволі паспяховы ўкраінскі вопыт. У прыватнасці, у 1935 г. група дзеячоў на чале з дырэктарам Віленскай беларускай рады Р. Астроўскім прапанавалі стварыць у Вільні мясцовы аддзел “Таварыства імя мітрапаліта Пятра Магілы”. Аднак дадзеная ідэя не была рэалізавана па прычыне негатыўных адносін польскіх уладаў, якія з сярэдзіны 1930-х гг. пачалі праводзіць больш жорсткую палітыку паланізацыі і згортвання беларускай культурна-асветніцкай актыўнасці [11, арк. 12].

Асаблівасцю міжваеннага перыяду з’яўлялася існаванне ў Заходняй

Беларусі не толькі праваслаўных арганізацый культурна-асветніцкага характару, але і праваслаўных палітычных структур. Адной з найбольш вядомых арганізацый падобнага роду было Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (ПБДА), створанае сенатарам польскага парламента, вядомым царкоўным дзеячам В. Багдановічам восенню 1927 г. Дадзеная структура з'яўлялася спробай Багдановіча аб'яднаць праціўнікаў аўтакефаліі Праваслаўнай царквы ў Польшчы і прыхільнікаў кананічных сувязяў з Маскоўскім патрыярхатам вакол нацыянальных беларускіх каштоўнасцяў. Палітычная праграма арганізацыі абапіралася на распаўсюджаную ў той час ідэалогію хрысціянскага дэмакратызму. Асноўнай палітычнай задачай ПБДА было імкненне да арганізацыі культурна-палітычнага жыцця беларускага народа "на грунце хрысьціянска-дэмократычных ідэалаў і беларускай народнай культуры" [12, с. 3]. Акрамя гэтага, арганізацыя дамагалася ўладкавання царквы на саборных пачатках паводле прынцыпа кананічнасці, што прадугледжвала крытычнае стаўленне да афіцыйнай польскай праваслаўнай іерархіі, якую члены ПБДА лічылі "некананічнай" [12, с. 2]. В. Багдановіч разам са сваімі прыхільнікамі прыняў актыўны ўдзел у перадвыбарчай кампаніі ў польскі парламент 1928 г., аднак пасля выбараў дзейнасць ПБДА была незаўважанай. У 1927–1928 гг. арганізацыя выдавала свой друкаваны орган – часопіс "Праваслаўная Беларусь", на старонках якога асвятляліся пытанні аўтакефаліі, царкоўна-дзяржаўнага ўзаемадзеяння, беларусізацыі царквы і інш.[1, с. 52]. Адносная палітычная слабасць арганізацыі была абумоўлена апазіцыйным стаўленнем яе сяброў да духоўных уладаў Польскай аўтакефальнай царквы і постаццю самога Багдановіча, на якога была накладзена анафема. Гэтыя акалічнасці адштурхнулі вернікаў і духавенства ад актыўнага ўдзелу ў дзейнасці ПБДА. Апошнія выяўленныя звесткі аб існаванні гэтай арганізацыі датуюцца 1933 г. [13, арк. 11].

У 1930-я гг. у беларускае грамадска-палітычнае жыццё прыйшло маладое пакаленне дзеячоў, якое надало праблемам беларусізацыі царкоўнага жыцця новае гучанне. У 1931 г. у Віленскім універсітэце былі ўтвораны дзве арганізацыі – "Беларуска-праваслаўная група студэнтаў Універсітэта Стэфана Баторыя" і "Хаўрус беларускай праваслаўнай моладзі", якія пашыралі сярод студэнцкай моладзі ідэю беларусізацыі царквы і выступалі за пэўныя змены ў структуры духоўнай улады па прычыне нізкага маральнага стану духавенства [14]. У прыватнасці, 3 кастрычніка 1931 г. "Беларуска-праваслаўная група студэнтаў Універсітэта Стэфана Баторыя" падала мітрапаліту Дыянісію (Валедзінскаму) мемарыял, у якім прасіла польскага першаіерарха звярнуць увагу на ўнутранае жыццё Віленскай епархіі і на амаральныя паводзіны некаторых святароў [15, с. 15]. Найбольш актыўным дзеячом гэтых арганізацый быў

студэнт юрыдычнага факультэта Віленскага ўніверсітэта, псаломшчык Ефрасіннеўскай царквы, паэт і публіцыст С. Сарока [16, s. 394].

Дзякуючы ў тым ліку маладому актыву ў 1930 г. у Вільні была створана яшчэ адна грамадская арганізацыя рэлігійнага напрамку – Цэнтральны беларускі праваслаўны камітэт па беларусізацыі царквы (ЦБПК). У прэзідыўм камітэта ўвайшлі Т.Вернікоўскі (старшыня), святар А.Коўш (1-ы віцэ-старшыня), У.Більдзюкевіч (2-і віцэ-старшыня), С.Сарока (сакратар), М.Маскалік (скарбнік) і інш. [17, арк. 10].У сваёй працы ЦБПК ставіў наступныя мэты: узмацніць паміж праваслаўнымі беларусамі хрысціянскую мараль на нацыянальным грунце, зблізіць духавенства з народам шляхам назначэння на духоўныя пасады асобаў беларускай нацыянальнасці, правесці беларусізацыю духоўных кансісторыяў і Віленскай духоўнай семінарыі. Дзеля дасягнення гэтых мэтаў была абрана адмысловая страгэгія. Камітэіт абавязаўся клапаціцца аб нацыянальнай беларускай асвеце ў царкве, адчыняць школы, бібліятэкі, бараніць правы беларускага духавенства і праваслаўных беларусаў перад дзяржаўнымі ўладамі. Паводле статуту, ЦБПК пашыраў сваю дзейнасць на ўвесь абшар з беларускім насельніцтвам. Яго сябрамі маглі быць асобы праваслаўнага веравызнання беларускай нацыянальнасці, а таксама асобы іншых нацыянальнасцей, калі яны “прынясуць асаблівую карысць справе беларусізацыі царквы”[17, арк. 3-5].

Неабходна заўважыць, што ў асноўным дзейнасць ЦБПК абмяжоўвалася складаннем розных мемарыялаў да духоўных уладаў з патрабаваннем беларусізацыі царкоўнага жыцця. Немалаважную ролю ў дзейнасці арганізацыі адыгрывалі асабістыя кантакты кіраўнікоў з праваслаўнымі іерархамі. Напрыклад, падчас прыватнай сустрэчы Т. Вернікоўскага з віленскім епіскапам Феадосіем (Феадосьевым) абмяркоўвалася магчымасць заснавання ў Варшаве беларускамоўнага праваслаўнага часопіса [18, арк. 312]. ЦБПК выдаваў таксама свой уласны друкаваны орган – часопіс “Сьветач Беларусі”, які выходзіў з перапынкамі ў 1931–1936 гг. пад рэдакцыяй У. Більдзюкевіча.

З’яўленне камітэта выклікала даволі негатыўную рэакцыю з боку кансерватыўнай часткі духавенства. Да таго ж дзеячы ЦБПК адразу ўключыліся ў спрэчкі і сваркі паміж рознымі беларускімі палітычнымі партыямі, арганізацыямі і групамі, што не надавала арганізацыі пазітыўнай рэпутацыі. Развіццю арганізацыі не садзейнічалі і праўрадавыая паланафільская пазіцыя яе кіраўніцтва (Т. Вернікоўскі раней узначальваў шэраг беларускіх паланафільскіх арганізацый – А. Г.), што ў беларускім асяроддзі міжваеннага часу ўспрымалася вельмі крытычна. Гэтыя акалічнасці прадвызначылі паступовы заняпад ЦБПК і яго дзейнасці, хаця спробы рэанімацыі арганізацыі мелі месца ў другой палове 1930-х гг. [19, с. 95].

Такім чынам, у міжваенны перыяд на тэрыторыі Беларусі дзейнічаў шэраг беларускіх праваслаўных арганізацый, асноўнай мэтай якіх было пашырэнне сярод вернікаў ідэі беларусізацыі царкоўнага жыцця і хрысціянскіх каштоўнасцей, развіццё культурных і асветніцкіх праектаў, падтрымка духавенства і царкоўнаслужыцеляў. Меншую ўвагу гэтыя арганізацыі надавалі пытанням дабрачыннасці, што магло безумоўна дапамагчы ім пашырыць сваю грамадскую базу. Негатыўныя адносіны ўладаў, крытычнае стаўленне кансерватыўнай часткі духавенства да беларускіх праваслаўных арганізацый стрымлівалі іх развіццё і звужалі поле дзейнасці. Тым не менш у сённяшняй Беларусі назіраецца паступовае адраджэнне праваслаўных грамадскіх рухаў, некаторыя з якіх працягваюць актыўна ўзнімаць праблемы захавання беларускай мовы ў царкоўнай штодзённасці.

## СПІСАК ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Кулажанка, Л., З вопыту асветніцкага служэння Праваслаўнай царквы (Заходняя Беларусь: 1920–30-я гг.) / Л. Кулажанка // Праваслаўе. – 1999. – № 8. – С. 38–57.
2. Горны, А. Да гісторыі Цэнтральнага беларускага праваслаўнага камітэта па беларусізацыі царквы / А. Горны // Наша слова. – 2012. – №15. – С. 6–7.
3. А. Л. Прат. Міхал Галенкевіч // А. Л. // Сялянская праўда. – 1924. – 14 лістапада (№20). – С. 3.
4. Пісьмо Патрыярха Тіхона // Беларускі сьцяг. – 1922. – № 1. – С. 27 – 28.
5. Летопись. Софийский собор в городе Гродне // Черепица, В.Н. Не потерять связующую нить: История Гродненщины XIX-XX столетий в событиях и лицах (исследования, документы, комментарии) / В. Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2003. – С. 221–256.
6. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі / уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт., камент., пер., паказ. С. Шупы. – Вільня; Нью-Ёрк; Менск; Прага: Беларускі інстытут навукі й мастацтва, Таварыства беларускага пісьменства, Наша ніва, 1998. – Т.1, Кн. 1. – 850 с.
7. Малевіч, Ант. Тодар Вернікоўскі / Ант. Малевіч // Сьветач Беларусі. – 1936. – № 2. – С. 5 – 7.
8. Пропаведзь па-беларуску // Беларуская думка. – 1919. – № 23. – С. 4.
9. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 203. Статут беларускага св. Троіцкага праваслаўнага таварыства.
10. Адамковіч, А. Беларусы ў Літве: учора і сёння. Кніга II – З Богам

па-беларуску / А. Адамковіч. – Вільня : “Kryvija”, 2016. – 364 с.
11. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 53. Ap. 23. B. 2005. Akta w sprawie rejestracji i likwidacji związków i stowarzyszeń (statuty, sprawozdania, protokoły, korespondencja). Towarzystwo Oświaty Białoruskiej.
12. Праваслаўна-Беларускае Дэмократычнае Аб’еднаньне (Праграма) // Праваслаўная Беларусь. – 1927. – № 3. – С. 2 – 4.
13. LCVA. – F. 306. Ap. 1. B. 13. Протоколы и резалюции заседания православной комиссии при Белорусском национальном комитете.
14. Kronika. Sprawy białoruskie // Kurjer Wileński. – 1931. – Nr 249. – S. 3.
15. Хроніка // Сьветач Беларусі. – 1931. – № 2. – С. 14 – 16.
16. Garbiński J. Białoruski ruch chrześcijański XX wieku: słownik biograficzno-bibliograficzny / J. Garbiński, J. Turonek. – Warszawa : Slawistyczny Ośrodek Wydawniczy IS PAN, 2003. – 519 s.
17. БДАМЛіМ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 198. Дакументы Цэнтральнага Беларускага праваслаўнага камітэта ў г.Вільня за 1930 г.
18. LCVA. – F. 53. Ap. 23. B. 931. Sprawozdania sytuacyjne z życia społecznego i politycznego m. Wilno 1929 r.
19. Вабішчэвіч, А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А.М. Вабішчэвіч – Брэст : БрДУ, 2008. – 319 с.